## Тэма 1. 2 Узнікненне савецкай дзяржавы і аднаўленне незалежнасці Польшчы, фарміраванне асноў іх палітыкі ў дачыненні да Беларусі.

План

1. Пытанне самавызначэння народаў у праграмных дакументах бальшавіцкай партыі.
2. Брэсцкі мір і беларускае пытанне.
3. Абвяшчэнне ССРБ і стварэнне ЛітБел у палітыцы Савецкай Расіі.
4. Распрацоўка польскай палітычнай элітай пытання аб граніцах краіны.

ЛІТАРАТУРА


Версальский мирный договор. – М. : Изд-во НКИД, 1925 – 214 с.

Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск: «Юніпак», 2008. – Т. 1, ч. 1.

Документы внешней политики СССР: в 22 т. – М. : Госполитиздат, 1959 – 1960. – Т. 1–2.

Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14 т. – М. : Наука, 1966–1973. – Т. 1–2.

Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в советско-польских отношениях: Научное издание / Под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М. : Аспект Пресс, 2010. – 823 с.

Ціхаміраў, А. В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.) / А. В. Ціхаміраў. – Мн. : УП “Экаперспектыва”, 2003. – 400 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Мн. : “Беларуская ноавука”, 2012. – Кн. 1. – 588 с.


**1. Пытанне самавызначэння народаў у праграмных дакументах бальшавіцкай партыі.** Яшчэ да рэвалюцыі 1917 г. бальшавіцкая партыя ў сваіх праграмных дакументах абвясціла права народаў на самавызначэнне. Але гэта не азначала, што бальшавікі лічылі неабходным стварэнне кожным народам, у тым ліку і з тых, што ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, сваёй самастойнай дзяржавы. Так, у рэзалюцыі нарады ЦК РСДРП у 1913 г. у Пароніне ўтрымліваўся тэзіс, згодна якому не трэба змешваць права нацый на самавызначэнне з мэтазгоднасцю аддзялення той ці іншай нацыі. У кожным канкрэтным выпадку партыя павінна была прымаць рашэнне па гэтаму пытанню, зыходзячы з мэтазгоднасці барацьбы пралетарыята за сацыялізм. Гэтая ж думка была падкрэслена на красавіцкай 1917 г. канферэнцыі бальшавіцкай партыі.

Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў Савецкая Расія не збіралася адмаўляцца ад тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. Асноўныя напрамкі сваёй палітыкі па нацыянальнаму пытанню бальшавікі абнародавалі ў “Дэкларацыі правоў народаў Расіі” 2 (15 лістапада) 1917 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Яны абвясцілі права ўсіх народаў на самавызначэнне, але гэтае права разглядалася аўтарамі Дэкларацыі толькі як інструмент заваявання даверу працоўных розных нацыянальсцей для дасягнення іх адзінства ў граніцах Расійскай дзяржавы. У Дэкларацыі гаварылася, што палітыка царызму па нацыянальнаму пытанню "павінна быць заменена палітыкай добраахвотнага і чэснага саюза народаў Расіі". Стварэнне такога саюза дазволіць спаяць рабочых і сялян народаў Расіі "ў адну рэвалюцыйную сілу, здольную ўстаяць супраць ўсялякіх замахаў з боку імперыялістычна-анексіянісцкай буржуазіі". Змест Дэкларацыі дазваляе зрабіць выснову, што савецкі расійскі ўрад праз рэалізацыю права нацый на самавызначэнне зусім не збіраўся дапусціць распаду былой Расійскай імперыі на нацыянальныя дзяржавы. Права на самавызначэнне бальшавікі прызнавалі толькі за працоўнымі, і то толькі тэарэтычна. Наркам па справах нацыянальнасцей І. Сталін падкрэсліваў, што савецкі ўрад прызнае права нацый на аддзяленне ад Расіі, але пры яго ажыццяўленні трэба ўлічваць інтарэсы "народных мас як цэнтра так і ўскраін". А з пункту гледжання гэтых інтарэсаў "патрабаванне аддзялення ўскраін на дадзенай стадыі рэвалюцыі глыбока контррэвалюцыйнае". У артыкуле ў "Известиях" ад 9 лютага 1919 г. І. Сталін тлумачыў права народаў на самавызначэнне ў разуменні бальшавікоў як "добраахвотны саюз працоўных усіх незалежных савецкіх рэспублік" праз устанаўленне федэратыўнай сувязі з Савецкай Расіяй. Відавочна, што бальшавікі імкнуліся захаваць тэрытарыяльную цэласнасць былой Расійскай імперыі, падначаліць сваёй уладзе яе ўскраіны, у тым ліку, і заходнія.

Пытанне аб рэалізацыі права беларусаў на самавызначэнне набыло актуальнасць у сувязі са скліканнем І Усебеларускага з'езда. Ідэю склікання з'зда падтрымаў СНК Расіі ў асобе наркамата па справах нацыянальнасцей на чале з І. Сталіным. Наркамат вёў перамовы з Беларускім абласным камітэтам пры Усерасійскім з'ездзеце сялянскіх дэпутатаў. Была ў прынцыпе дасягнута дамоўленасць аб самавызначэнні Беларусі ў форме савецкай дзяржаўнасці на аснове шырокай аўтаноміі ў складзе Расійскай федэратыўкай рэспублікі. У перыяд 15–17 снежня 1917 г. І Усебеларускі з'езд прыняў рашэнні аб стварэнні мясцовай улады на тэрыторыі Беларусі. Яна павінна была стаць дэмакратычнай рэспублікай у складзе Федэратыўнай Расіі. Вышэйшым органам улады павінен быў стаць Усебеларускі з'езд сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Гэта значыць, савецкая ўлада захоўвалася. У рашэннях з'езда бальшавіцкае кіраўніцтва Заходняй вобласці ўбачыла пагрозу страты сваёй улады. Яно прыняло рашэнне аб разгоне з'езда, што і было зроблена ў ноч на 18 снежня. Абраны Выканкам Рады з'езда пачаў дзейнічаць у падполлі.

**2. Брэсцкі мір і беларускае пытанне.** На ІІ Усерасійскім з'ездзе саветаў быў прыняты Дэкрэт аб міры. Ён прадугледжваў заключэнне міру "без анексій і кантрыбуцый" усімі ўдзельнікамі Першай сусветнай вайны. Аднак краіны Антанты не прынялі прапанову расійскага савецкага ўрада ўступіць у мірныя прамовы, дзяржавы Германскага блока адмовіліся іх весці на аснове Дэкрэту аб міры. У ліку патрабаванняў, агучаных на перамовах у Брэсце Германіяй і яе саюзнікамі, было далучэнне да Германіі заходніх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

раёнаў Беларусі. Для вырашэння беларускага пытання на брэсцкіх перамовах важным фактарам стаў удзел у іх УНР. 9 лютага 1918 г. краіны Германскага блока і УНР падпісалі дагавор, згодна з якім, у прыватнасці, паўднёвыя раёны Беларусі, у тым ліку ўся чыгуначная лінія Гомель – Брэст уключаліся ў склад украінскай дзяржавы.

Ва ўмовах, калі на перамовах у Брэсце ўзнікла пагроза падзелу Беларусі, Выканаўчы камітэт І Усебеларускага з’езда прыняў рашэнне накіраваць у Брэст беларускую дэлегацыю. 19 студзеня Выканкам зацвердзіў дэкларацыю, якую беларуская дэлегацыя павінна была зацвердзіць на перамовах. У ёй канстатавалася, што ўся Беларусь з’яўляецца адзінаю і непадзельнаю і на правах аўтаноміі ўваходзіць у склад Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі. Дэкларацыя патрабавала, каб акупаваныя часткі Беларусі былі вызвалены ад замежных войскаў. Паколькі беларускую дэлегацыю па загаду Л. Троцкага не прапусцілі па чыгунцы Баранавічы – Брэст, яна вымушана была дабірацца праз Кіеў і прыбыла ў Брэст толькт 15 лютага. На гэты момант Троцкі ўжо пакінуў Брэст, перамовы былі перарваны. Прадстаўнікам беларускай дэлегацыі ўдалося сустрэцца толькі з германскім дыпламатам Шылерам, а рэальнага ўдзелу ў перамовах яны не прынялі.

18 лютага германская армія пачала наступленне і на пачатак сакавіка заняла тэрыторыю Беларусі да лініі Расоны – Орша – Магілёў – Жлобін – Гомель. У такой сітуацыі 20 лютага Выканкам Рады І Усебаларускага з’езда абнародаваў І Устаўную грамату. Згодна з ёю Выканкам абвясціў сябе часоваю ўладаю на тэрыторыі Беларусі. Стварaўся Народны сакратарыят ў якасці выканаўчага органа ўлады. Менавіта брэсцкія перамовы і паграза падзелу Беларусі далі штуршок Выканкаму перайсці да рашучых крокаў па канстытуцыянаванню Беларускай дзяржаўнасці. Спробы Народнага сакратарыята знайсці падтрымку з боку германскіх акупацыйных улад не прынеслі станоўчых вынікаў.

3 сакавіка 1918 г. у Брэсце быў падпісаны мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і краінамі Германскага блока. Паводле яго вобласці, якія знаходзіліся на захад ад лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны – Брэст, выводзіліся з-пад юрыздыкцыі Расіі і іх лёс павінны былі вызначаць Германія і Аўстра-Венгрыя. Тэрыторыя Беларусі на ўсход ад названай лініі лічылася часова акупаванай германскімі войскамі. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся незалежнымі дзяржавамі. Паколькі Расія і Германія ўзаемна адмаўляліся ад пагашэння страт, якія вайна прынесла насельніцтву, то ў беларусаў не было ніякіх шансаў атрымаць кампенсацыю за страты, панесеныя ў сувязі з баявымі дзеяннямі на тэрыторыі Беларусі. Беларускія дзеячы ва ўмовах Брэсцкага міра бачылі сваю важнейшую задачу ў тым, каб дабіцца прызнання Беларусі суб’ектам міжнародных адносін. Менавіта гэтым імкненнем у многім вызначалася выданне ІІ і ІІІ Устаўных грамат, першая з якіх абвясціла БНР, а другая дэкларавала яе незалежнасць.

Германія прытрымлівалася палажэнняў Брэсцкага дагавора, згодна з якімі тэрыторыя Беларусі прызнавалася часткаю Расіі і знаходзілася толькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пад часоваю германскаю акупацыяй. Гэта рабіла вельмі праблематычным для лідараў БНР дабіцца ад уладаў Германіі прызнання незалежнасці беларускай дзяржавы. 27 жніўня Германія і Савецкая Расія падпісалі Дадатковы дагавор да Брэсцкага міру. Ён прадугледжваў адвод германскіх войскаў за лінію р. Бярэзіна і перадачу беларускіх тэрыторый паміж Дняпром і Бярэзінай пад уладу Расіі. 29 жніўня па патрабаванню Германіі СНК Расіі выдаў дэкрэт, згодна з якім Расія анулявала ўсе пагадненні, якія датычыліся падзелаў Рэчы Паспалітай. Тым самым юрыдычна неабгрунтаваным абвяшчалася далучэнне да Расіі зямель Рэчы Паспалітай, а ў Польшчы з'явіліся дадатковыя падставы для абгрунтавання прытэнзій на былыя «ўсходнія крэсы».

**3. Абвяшчэнне ССРБ і стварэнне ЛітБел у палітыцы Савецкай Расіі.** 11 лістапада 1918 г. Германія падпісала Камп'енскае перамір'е і прызнала тым самым сваё паражэнне ў Першай сусветнай вайне. Гэта змяніла міжнародна-палітычную сітуацыю і ва Усходняй Еўропе. 13 лістапада 1918 г. УЦВК ануляваў Брэсцкі мірны дагавор. Чырвоная Армія, рухаючыся ўслед за адыходзячымі германскімі войскамі, пачала займаць у ліку іншых і тэрыторыю Беларусі. Наступленне Чырвонай Арміі разглядалася многімі лідарамі бальшавікоў як спосаб прынесці рэвалюцыю ў еўрапейскія краіны. Л. Троцкі заявіў 18 лістапада: "Праз Кіеў вядзе прамая дарога да злучэння з аўстра-венгерскай рэвалюцыяй, гэтак жа як праз Пскоў і Вільню праходзіць дарога да злучэння з германскай рэвалюцыяй. Наступленне на ўсіх франтах!". Праз тэрыторыю Беларусі ляжаў найбольш кароткі шлях для распаўсюджвання з дапамогай штыкоў Чырвонай Арміі рэвалюцыі на еўрапейскія краіны. Дадзены фактар і вызначаў палітыку ўрада Леніна ў адносінах да Беларусі літаральна да канца снежня 1918 г. Ён імкнуўся захаваць Беларусь пад сваім непасрэдным кантролем. Таму ў ланцужку савецкіх нацыянальных рэспублік, стварэнне якіх намячаў СНК на тэрыторыях, пакідаемых германскімі вайскамі, Савецкая Беларусь першапачаткова не значылася. У пастанове УЦВК ад 13 лістапада 1918 г. пералічваліся тэрыторыі на заходніх ускраінах Расіі, працоўныя якіх, на думку бальшавікоў, "павінны цяпер самі вызначаць свой лёс". У ліку гэтых тэрыторый Беларусь не прыгадвалася. У лісце на імя галоўнакамандуючага Чырвонай Арміяй Вацэціса У. Ленін даручаў аказаць падтрымку савецкім урадам Латвіі, Эстляндыі, Украіны і Літвы. Як бачым, аб ставарэнні беларускага савецкага ўрада гаворка не ідзе.

У апошняй дэкадзе снежня стала відавочна, что ў бліжэйшы час разлічваць на перамогу рэвалюцыі як у Германіі, так і Польшчы не даводзіцца. Пры гэтым станавілася відавочнай пагроза ўзнікнення ў бліжэйшы час польска-савецкай вайны. У сувязі з гэтым змянілася палітыка Савецкай Расіі ў дачыненні да Беларусі. Было прызнана мэтазгодным стварэнне Савецкай Беларускай рэспублікі як буфера паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Становішча бальшавікоў на франтах грамадзянскай вайны ў гэты час было даволі складаным. З'яўленне яшчэ і польскага фронта зрабіла б становішча ўрада Леніна яшчэ больш няўстойлівым. Таму важна было адтэрмінаваць канфлікт з Польшчый. У. Ленін схіляецца да магчымасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падпісання з Польшчай пагаднення, падобнага да Брэсцкага міру. Але на гэты раз, каб пазбегнуць палітычнага крызіса, аналагічнага таму, які выклікаў Брэсцкі дагавор, намячалася саступаць Польшчы ў якасці платы за захаванне міру тэрыторый, якія фармальна не належалі Савецкай Расіі, а ўваходзілі ў склад буфернай Беларускай рэспублікі.

Менавіта ЦК РКП(б) у сілу пераважна геапалітычных прычын 24 снежня было прынята рашэнне аб абвяшчэнні ССРБ. 27 снежня ў Маскве адбылася нарада І. Сталіна з прадстаўнікамі Аблвыкамзаха па гэтаму пытанню. 30 снежня пачала работу VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Яна дэкларавала сябе І з'ездам КП(б)Б, абвясціла ССРБ і вызначыла тэрыторыю гэтай рэспублікі ў складзе Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў. Аднак у складзе пяці губерняў ССРБ праіснавала толькі два тыдні. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне перадаць са складу ССРБ у склад Савецкай Расіі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні. У. Ленін, тлумачачы гэтае рашэнне, адзначаў, што рэспубліка буферная, і павінна ўключаць тыя тэрыторыі, якія граніча<br>ць з іншымі краінамі. Паколькі Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні не граніча<br>ць, то іх трэба перадаць Расіі. Таксама намячалася аб'яднанне ССРБ з Савецкай Літвой. Прадстаўнік ЦК РКП(б) у Беларусі А. Іофе прама заявіў на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 22 студзеня 1919 г., што прэтэнзіі польскага імперыялізму могуць быць вырашаны дыпламатычным шляхам, для чаго было неабходна, каб Польшча сутыкнулася з буферамі і для чаго стваралася Беларуская ССР.

2–3 лютага 1919 г. праходзіў І Усебеларускі з'езд саветаў. Прыбыўшы на з'езд старшыня УЦВК Я. Свярдлоў заявіў аб прызнанні незалежнасці ССРБ з боку Савецкай Расіі. Ён абнародаваў рашэнне бальшавіцкага кіраўніцтва аб перадачы трох усходніх губерняў Савецкай Беларусі ў склад Савецкай Расіі і аб аб'яднанні Савецкай Беларусі і Савецкай Літвы. З'езд пагадзіўся з гэтымі рашэннямі і прыняў дэкларацыю аб устанаўленні федэратыўных сувязей з Савецкай Расіяй.

**4. Распроцоўка польскай палітычнай элітай пытання аб граніцах краіны.** 11 лістапада 1918 г. аднавіла незалежнасць Польшча. Яе палітычная эліта пачала распрацоўваць праекты граніц адроджанай дзяржавы яшчэ ў час Першай сусветнай вайны. Адзін з першых дакументаў, у якім былі сфармуляваны тэрытарыяльныя прэтэнзіі маючай адрадзіцца Польшчы – дэкларацыя Р. Дмоўскага да міністра замежных спраў Англіі А. Бальфура ад 30 сакавіка 1917 г. Ён прапанаваў правесці ўсходнюю граніцу Польшчы па лініі Вільня, Дзвінск, Мінск, Пінск, Роўна, Камянец-Падольскі. Р. Дмоўскі лічыў прапанаваны ім варыянт усходняй граніцы кампрамісным, бо значаная частка "гістарычнай Польшчы" павінна была застацца за межамі польскай дзяржавы, але пры гэтым яна павінна ўключыць тыя правінцыя, дзе, згодна яго меркаванню, заходняя (польская) цывілізацыя пусціла глыбокія карані.

У пачатку кастрычніка 1918 г. пытанне аб польскай граніцы абмяркоўвалася на пасяджэнні Польскага нацыянальнага камітэта (ПНК) у Парыжы. Прынятыя на ім рашэнні 8 кастрычніка былі даведзены да В.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вільсана ў спецыяльным мемарыяле. У ім адзначалася, што Польшча павінна быць "моцнай дзяржавай", пры гэтым мець дастаткова аднароднае насельніцтва, каб забяспечыць "унутраную злітнасць". Далей канкрэтызуюцца межы будачай Польшчы. Яе тэрыторыя павінна ўключаць на ўсход ад Каралеўства Польскага большую частку Віленскай губерні, Гродзенскую губерню, "дзе палякі ў большасці, або нязначнай меншасці", большую частку Мінскай губерні, "якая ахоплівае Мінск, Слуцк, Пінск". Астатнія беларускія землі "павінны былі вярнуцца да Расіі". На аснове рашэнняў ПНК была вызначана лінія граніцы Польшчы, якая атрымала назву "лінія Дмоўскага". Адпаведную карту пасланнік ПНК С. Грабскі прадставіў у канцы 1918 г., калі прыбыў з Парыжа ў Варшаву для перагавораў з Ю. Пілсудскім. ПНК меў намер адстойваць названую лінію граніцы на Парыжскай мірнай канферэнцыі і хацеў узгадніць гэтае пытанне з начальнікам дзяржавы. 16 снежня С. Грабскі паведаміў ПНК, што на перамовах начальнік дзяржавы выказаўся за граніцу, якая павінна праходзіць па лініі Ула, Бярэзіна, Случ, Гарынь. Гэта было блізка да "лініі Дмоўскага" і азначала непасрэднае ўключэнне асноўнай часткі Беларусі ў склад Польшчы.

У польскай палітычнай эліце сфарміравалася два асноўныя варыянты вырашэння лёсу "ўсходніх крэсаў". Правыя палітычныя сілы, перш за ўсё нацыянальная дэмакратыя на чале з Р. Дмоўскім, лічылі неабходным ажыццявіць падзел гэтых тэрыторый з Расіяй, значна адступіўшы ад граніцы 1772 г. Тым самым правыя спадзяваліся пазбегнуць рэваншысцкіх памкненняў з боку Расіі, захаваць з ёй добрыя адносіны, што было неабходна, каб супрацьстаяць германскай пагрозе. Гэтая канцэпцыя атрымала назву інкарпарацыя.

Ю. Пілсудскі вылучыў канцэпцыю федэрацыі. Яна прадугледжвала непасрэднае ўключэнне ў склад Польшчы заходніх тэрыторый Беларусі і Украіны. На землях былога ВКЛ планавалася стварэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы, а таксама Украінскай дзяржавы, якія ўтварылі б унію з Польшчай. У федэралісцкай палітыцы Пілсудскага аб'ядналіся дзве мэты. Адной мэтай было аслабленне Расіі праз яе разчляненне. Другой – узмацненне Польшчы з дапамогаю федэралізму. У выпадку рэалізацыі гэтага плана Расія была б адсунута далёка на ўсход, істотна аслаблена і не пагражала б Польшчы, якая набыла б антырасійскіх саюзнікаў на ўсходзе. Прыхільнікі інкарпарацыі бачылі адзін з важнейшых недахопаў планаў стварэння федэрацыі ў тым, што размешчаная паміж Польшчай і Расіяй буферная дзяржава будзе полем пастаяннай барацьбы паміж імі. А гэта будзе аслабляць Польшчу перад германскай пагрозай. Другі матыў на карысць ідэі інкарпарацыі яе прыхільнікі бачылі ў неабходнасці дасягнення для Польшчы пагаднення з Расіяй, каб супрацьстаяць Германіі. Канцэпцыя федэрацыі хаця бы тэарэтычна давала шанс на ўтварэнне беларускай дзяржавы ў той ці іншай форме. У той час як пры рэалізацыі канцэпцыі інкарпарацыі Беларусь павінна была быць падзеленай паміж Расіяй і Польшчай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ